цына Перелелі і кампазітар Кацярына Аверкава.

**Праект.** Творчы вечар «Песняры»: малітвы галасоў і сэрцаў», прысвечаны 55-годдзю Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры», прайшоў у Нацыянальнай бібліятэцы. Удзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з выстаўкай, прымеркаванай да юбілею музычнага калектыву. Падчас імпрэзы таксама прэзентавалі асветніцкі віртуальны праект, які дапаможа папулярызаваць ансамбль сярод шырокай аўдыторыі, у тым ліку сучаснай моладзі. Ён падрыхтаваны Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі сумесна з музеем У. Г. Мулявіна Беларускай дзяржаўнай філармоніі, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва і Нацыянальным гістарычным музеем.